Сабаленка Э.Р.,
канд.гіст.навук,
дацэнт

## ЭСТЭТЫКА Ў СІСТЭМЕ ГУМАНІТАРНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Месца эстэтыкі ў сістэме гуманітарных навук забяспечвае ёй асаблівае значэнне для падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы культуры. Самая цесная повязь эстэтыкі з філасофіяй павінна паспрыяць студэнтам універсітэта культуры, людзям часцей за ўсё з больш развітым эмацыянальна-вобразным мысленнем, навучыцца разважаць на філасофскім узроўні, разбірацца ў праблемах філасофіі, абапіраючыся на больш блізкі ім эстэтычны матэрыял, перш за ўсё на матэрыял мастацтва. Паколькі эстэтыка знаходзіцца ў падпарадкаванні філасофіі, вывучэнне яе мэтазгодна пачынаць пасля засваення студэнтамі курса філасофіі. З аднаго боку, гэта дапаможа больш глыбока, на філасофскім узроўні, спасцігаць эстэтычныя праблемы, з другога ж, канкрэтызуе, замацуе, удасканаліць веданне філасофіі. Такім чынам, эстэтыка адыграе надзвычай важную ролю ў фарміраванні глыбокага, навукова абгрунтаванага светапогляду будучых работнікаў культуры.

Няменшае значэнне мае эстэтыка і для прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў універсітэта культуры. З'яўляючыся металагічнай асновай усіх відаў дзейнасці чалавека ў сферы культуры, эстэтыка дапаможа пісьменна, на высокім прафесійным узроўні, праявіць сябе спецыялісту і ў мастацтве як прафесійным, так і самадзейным, і ў мастацтвазнаўстве, і мастацкай крытыцы, і ў абрадавай дзейнасці, і ў бібліятэчнай рабоце, і ў маркетынгу. Нельга гаварыць аб высокай культуры дзейнасці чалавека, калі не ўлічваецца яе эстэтычны бок. Пагэтаму трэба дамагацца, каб для студэнтаў універсітэта культуры жыццёвай неабходнасцю стала веданне асноўных эстэтычных законаў і кіраванне імі ў сваёй будучай працы.

Акрамя таго, без грунтоўнай эстэтычнай падрыхтоўкі наогул нельга ўявіць сабе сучаснага інтэлігента, тым больш у сферы культуры. Таму эстэтыка побач з іншымі гуманітарнымі навукамі павінна дапамагаць студэнтам уключацца ў кантэкст сусветнай культуры. Эстэтыка дае неабходныя спецыялісту ў галіне культуры веды аб гістарычным развіцці эстэтычнай думкі, сучасных напрамках, школах, тэорыях, аб законах хараства і мастацтва. І калі мы сур'ёзна хочам удасканальваць гуманітарную падрыхтоўку нашых студэнтаў, у тым ліку і эстэтычную, выходзіць на еўрапейскі ўзровень навучання, нам неабходна ў бліжэйшы час распрацаваць і ўвесці дзесяткі спецкурсаў, у якіх больш грунтоўна, чым у агульным курсе, можна разглядаць асобныя праблемы эстэтыкі, дасканала вывучаць навуковыя працы, якія ведае ўвесь адукаваны свет і якім, на жаль, па нашых праграмах нельга адвесці належнае месца. Трэба побач з абавязковым для ўсіх студэнтаў кароткім агульным курсам смела ўводзіць факультатывы, спецкурсы на выбар. Толькі такім шляхам мы здолеем забяспечыць грунтоўную гуманітарную падрыхтоўку студэнтаў, якая будзе адпавядаць універсітэцкаму статусу.

Смялянская І.І.,
дацэнт

## СТАТУС ВЫКЛАДЧЫКА ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЫ

Прафесіяналізм выкладчыка, яго ўзровень і наогул прэстыж навучальнай установы, на наш погляд, лепш за ўсё адлюстроўваецца праз прызму статуса выкладчыка ў розных аспектах: чалавека, настаўніка, выхавацеля і інш.

Наконт гэтага хацелася б выказаць свае меркаванні. Па-першае, для ажыццяўлення той праграмы, якая азначана назвай гэтай канферэнцыі, і дзеля павышэння прэстыжу нашага універсітэта мы павінны навучыцца паважаць сябе.

Калі мы хочам арыентавацца на сусветны вопыт, то патрэбна пачынаць з выкладчыка, тым больш, што сёння ўвесь свет звяртаецца да асобы.

Усе мы людзі, у кожнага з нас ёсць сем'і, і хочам мы гэтага ці не, павінны клапаціцца аб сваёй сям'і. Слабая матэрыяльная забяспечанасць не дазваляе трымаць прыслугу, усе віды паслуг даражаюць, і ад некаторых мы вымушаны адказвацца і выконваць самі. Дзяржава значна дапамагчы сёння яшчэ не можа. Таму трэба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шукаць нейкія ўнутраныя рэзервы. І, першае, ісці не шляхам павелічэння вучэбнай нагрузкі, а шукаць аптымальныя варыянты, улічваючы чалавечы фактар, межы яго магчымасцей, якія б дазвалялі развіваць і павышаць свой прафесіянальны ўзровень. Мы пераканаліся на прыкладзе шматгадовага развіцця нашай краіны, што павелічэнне колькасці не гарантуе якасці.

Другое, што патрабуе абмеркавання, - гэта сістэма нагляда навучання. Ці патрэбна сёння абавязковае наведванне студэнтамі ўсіх заняткаў? На наш погляд, не.

Па кожнай дысцыпліне мы павінны выдзеліць некалькі працэнтаў (60--70) абавязковага наведвання студэнтамі заняткаў. Матэрыял, які можна засвоіць самастойна, студэнты рыхтуюць індывідуальна і ў адведзеныя гадзіны сустракаюцца з выкладчыкамі. Для гэтага ў кожнага выкладчыка павінна быць разгорнутая рабочая праграма па курсу, прычым індывідуальная (магчымасць вар'іраваць тэмамі, гадзінамі, праблемамі у рамках курса). Тым больш, што ў нас прадугледжаны гадзіны для кантролю за самастойнай працай студэнтаў, шмат студэнтаў маюць дазвол на вольнае наведванне заняткаў (на жаль, не заўсёды лепшыя).

Неабходна ўлічваць, што многія студэнты працуюць і не заўсёды маюць магчымасць наведваць заняткі. Для гэтага і трэба прадугледзець больш гібкую праграму, няхай выбіраюць, як ім зручней. Уклаліся ў адпаведныя гадзіны -- добра, не -- плаціце.

А калі студэнты не спраўляюцца, адлічаць і не баяцца, што прыйдзецца звальняць выкладчыкаў. Лепш скараціць ім нагрузку. Так мы павялічым і прэстыж нашага універсітэта.

Крыуліна С.У., ст.выкладчык

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ І ІНАВАЦЫЙНЫХ ФОРМ НАВУЧАННЯ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ АСОБНЫХ ТЭМ КУРСА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Сёння ў Беларусі ўсё больш узрастае цікавасць да роднай гісторыі, бо гісторыя нашай Бацькаўшчыны багатая і велічная. Людзі імкнуцца даведацца пра мінулае сваёй краіны, пра вытокі беларускай нацыі, асэнсаваць гісторыю ўсяго чалавецтва. Цяпер, ва ўмовах крызісу ідэалаў і каштоўнасцей, калі само жыццё ўносіць карэктывы ў нашу свядомасць, асабліва неабходна памятаць аб тым, што істотную ролю ў гістарычнай навуцы адыгрывае асабістае ўспрыманне падзей і фактаў. Улічваючы той момант, што жыццё карэнным чынам прымушае пераасэнсоўваць нашы ўяўленні аб тых ці іншых падзеях, вельмі важна сёння пры выкладанні курса па гісторыі Беларусі ў ВНУ дапамагчы студэнту больш поўна ўбачыць тую ці іншую праблему ва ўсіх супярэчлівасцях.

Вырашыць гэту праблему дапамагаюць семінарскія заняткі па курсу "Гісторыя Беларусі" ў ВНУ. Спецыфіка семінарскіх заняткаў заключаецца ў тым, што на іх падводзяцца вынікі самастойнай працы студэнтаў па той ці іншай тэме, працягваецца працэс паглыблення ведаў, выпрацоўваюцца ўменні палемізаваць, адстойваць свае меркаванні і погляды.

Формы семінарскіх заняткаў могуць быць рознымі: разгорнутая форма гутаркі, даклады студэнтаў, пісьмовыя рэфераты, семінары-дыспуты, семінары-калёквіумы, семінары ў музеях, прэс-канферэнцыі і іншыя. Кожная форма заняткаў мае свае станоўчыя і свае адмоўныя бакі. Таму ў працэсе навучання, на наш погляд, нельга прытрымлівацца адной формы, а ў залежнасці ад разглядаемай на семінары тэмы выкарыстоўваць розныя.

Больш падрабязна можна разгледзець методыку правядзення семінарскіх заняткаў па схеме дзялення студэнцкай групы на некалькі падгруп (так называемы дробнагрупавы метад). Гэта методыка дазваляе больш стымуляваць студэнта ў працы, больш паглыблена разгледзець той ці іншы перыяд гісторыі, фарміруе культуру палемікі, культуру пытанняў і адказаў. Студэнцкая група дзеліцца (добраахвотна) на 4 падгрупы, узначальвае кожную падгрупу лідэр (кіраўнік гэтай невялічкай групы). Функцыі кожнай падгрупы размяркоўваюцца наступным чынам: 1 група - дакладчыкі па тэме, 2 група - тыя, хто дапаўняюць дакладчыкаў, 3 група - апаненты, 4 група - рэцэнзенты.

Дакладчыкам на асвятленне пытання даецца 10-15 хвілін, пасля чаго выступае другая група па пытаннях, якія не прагучалі ў выступленнях дакладчыкаў (ім даецца 5-10 хвілін). Затым у палеміку ўступае група апанентаў, якая называе памылкі і невысветленыя моманты і задае пытанні дакладчыкам. Пасля адказу на гэтыя пытанні слова даецца рэцэнзентам. Яны даюць рэцэнзію